# АЛЬШАНСКІ ПЕРАЗВОН – 2024



Выданне падрыхтавана ўдзельнікамі творчай суполкі юных мастакоў слова “Альшанскі перазвон” па заказе адміністрацыі ДУА “Сярэдняя школа №39 імя І.Д. Лебедзева г. Гродна”.

Укладальнікі: Э.У. Урублеўская і вучні 9 класа: Жук Валерыя, Раманюк Дар’я, Кудратаў Мікіта, Кулеш Цімур, Русялевіч Аляксей, Неўмывака Валерыя, Місік Дзіяна, Коцькін Аляксандр, Стома Ангеліна.

Альшанскі перазвон / уклад.: Э.У. Урублеўская і інш. – Гродна: школьн. друк., 2024. – 64 с.

У альманах “Альшанскі перазвон” увайшлі мастацкія творы і малюнкі прадстаўнікоў грамадскасці ДУА “Сярэдняя школа № 39 г.Гродна”: настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў. Па жанры гэта ў асноўным вершы, апавяданні і казкі. Альманах рэкамендаваны чытачам любога ўзросту.



# АЛЬШАНСКІ ПЕРАЗВОН – 2024





ГРОДНА
2024



# Прадмова

Дружа-чытач! Прапануем тваёй увазе чарговы выпуск альманаха, у які ўвайшлі творы, дасланыя на агульнашкольны літаратурны конкурс, арганізаваны самымі актыўнымі ўдзельнікамі супольнасці юных літаратараў “Альшанскі перазвон”.

Гэты конкурс праводзіўся з нагоды дзвюх юбілейных дат: 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі і 10-годдзя нашай школы. На конкурс дасылаліся творы па трох намінацыях, таму зборнік дзеліцца на тры тэматычныя часткі.

У раздзеле “Беларусь непакораная” змешчаны творы і малюнкі, якія апавядаюць пра гераічную барацьбу беларускага народа за свабоду і панесеныя ў гэтай барацьбе ахвяры. Яны прасякнуты антываенным пафасам і жаданнем міру ва ўсім свеце.

Па добрай традыцыі ў альманаху нязменнай застаецца тэма сям’і і сямейных каштоўнасцей, таму раздзел “Мая сям’я – жыцця аснова” не менш значны па колькасці твораў.

Творы з раздзела “Школе любімай я песню спяваю…” перадаюць успаміны, думкі і пачуцці, звязаныя з нашай школай-юбілярам, шчырыя адносіны аўтараў да яе.

Жадаем табе, паважаны чытач, цікава і пазнавальна правесці час з нашым альманахам. Няхай тваё сэрца таксама, як і ў аўтараў мастацкіх і літаратурных твораў, напоўніцца шчырай любоўю да нашай Радзімы, школы, самых блізкіх і родных людзей.

***З надзеяй і павагай,***
***удзельнікі літаратурнай суполкі «Альшанскі перазвон»***







***Трацяк Рыта Антонаўна,***
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*

# Ты будзі сваю памяць

Ясна мірнае неба
На зямлю пазірае.
Лета з водарам хлеба
Цеплынёй ахінае.

Шчодра мірнае лета
Доляй-шчасцем адорыць
І ў бяздонні Сусвету
Сыпане жыцці-зоры.

Хай яны – маладыя –
Там вядуць карагоды,
Толькі каб не забылі:
Так было не заўсёды.

Там, у сорак чацвёртым,
Часта знічкі згаралі:
За свой дом і за бор той,
За жыццё – паміралі.

Усе не спалі, не елі,
Абліваліся потам…
Вочы дзетак глядзелі
З-за калючага дроту.

Поле цёплага хлеба
Танкам пляжыў чужынец.
Дымам грукалі ў неба
Мольбы соцень хатыняў.

Праз пакуты і жахі
Пранеслі Перамогу
Партызанскія шля́хі,

Франтавыя дарогі.
Пераможных салютаў
Расцвілі ў небе краскі.
Больш не будзе пакутаў!
Здымуць хлопчыкі каскі!

Грымне дожджык звычайны
З высяў вольнага неба.
І не танкі – камбайны
Паплывуць полем хлебным.

І жыццё пераможа,
Ўстане з друзу, з руінаў…
Ды набатам трывожным
Б’ецца сэрца Хатыні:

“Будзь удзячны, што дзеці
Бачаць сонейка промні!
Беражы мір у свеце!
Не забудзь! Помні! Помні!

Каб варожая замець
Не прыйшла зноў лавінай —
Ты будзі сваю памяць!
Спаць яна не павінна!”



*Петушок Анастасія, 9 “Д”*



***Паліна Герасімовіч,***
*10 "А"*

# Мая Радзіма дарагая!

Мая Радзіма дарагая!
Цябе, мой край, люблю, кахаю!
Ад бедаў дзетак захінала,
Пасля вайны з руін ўставала.

Ты надзяляла сілай дужай
Для барацьбы з варожай сцюжай.
Ты акрыляла ўсіх ідэяй,
На лепшы шлях дала надзею.

І ён не здаўся, наш народ,
Пераадолеў цяжкі гнёт,
Яго паклікаў родны край,
Азёр празрыстых светлы май.

І неба сіняе цяплее,
І тонуць ў зелені лясы,
Палі бязмежныя рунеюць,
Плятуць пад восень каласы.

Мой родны край, мая Айчына,
Любімы сэрцу васілёк!
Глядзіш азёр і рэк вачыма,
Як незабыўны мой куток.



*Нікан Алеся Анатольеўна,*
*мама Нікан Лізаветы, 2 “Д”*





***Янковская***
***Алла Геннадьевна***
*Победитель общешкольного литературного конкурса среди родителей*

# Беларуси непокорённой

Сражаясь много лет подряд,
Упав, ты каждый раз вставала
И супостатов злобный взгляд
Своим упорством поражала.

Кто павших может сосчитать?
Тех, кто погиб, тебя спасая,
Кому беречь и защищать
Досталась доля непростая?

Но вновь и вновь на смену им
Вставали новые герои,
Кто силой, мужеством своим
Сменить ушедших стал достоин.

И поднимаясь из руин,
Страна разрушенная наша,
Назло всем недругам твоим
Ты становилась лучше, краше.

А всем, кто нас хотел сломать
Или во тьме прокрасться вором,
Тут приходилось погибать
Иль спешно отступать с позором.

Тебе досталось, Беларусь,
Судьбы нелёгкой злое бремя.
Не плачь, не жалуйся, не трусь!
А кто был прав – рассудит Время.



*Янковская Алла Геннадьевна*



*Гарадовіч Ксенія, 6 “Д”*



80 ГАДОЎ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ



# Символ непобедимой Беларуси

Символ Беларуси – василёк: неброский полевой цветок, беззащитно голубеющий среди луговых трав. Сорвёт любой, кому заблагорассудится. Нет у василька острых шипов, как у роз. Не охраняют его, как альпийские эдельвейсы, неприступные горы. Нет в цветке смертоносной отравы, как у цикуты или болиголова. Не стерегут его покой, как у лотоса, непролазные болотные топи.

Расположенная в центре Европы, наша страна открыта со всех направлений нашествию любого агрессора. Исторически эта территория была вовлечена в разные годы не менее чем в восемьдесят войн. Мы не стремились достигать безопасности политическими интригами. Наши земли не берегли от нашествий высокие горы, и мы лишены преимуществ островных государств, чья граница – бурное море или необъятные просторы океана.

Но после каждой из войн, даже столь разрушительной, как Вторая мировая, белорусы в союзе с братскими народами возвращали своей стране её прежний облик. Неброский, милый и скромный – как василёк. Жизненная сила этого символа страны заключена не в шипах, отраве или надежном убежище. Он, как и трудолюбивый, терпеливый народ Беларуси, побеждает своим упорством.

Сколько раз ни перепахивай поле – среди желтеющих колосьев каждый год улыбаются небу голубеющие соцветия васильков. Неброские, скромные, внешне слабые, но непобедимые.






*Янковская Алла Геннадьевна*

***

Мы з вамі не сведкі жахлівай бяды,
За нас ваявалі прадзеды, дзяды.
І вось ужо восем дзясяткаў  гадоў
Пад небам пад мірным з табой мы жывём.
Мой бацька ні з кім не ідзе ваяваці,
Не ўскоквае раніцай з крыкамі маці,
Пад ложак не мкнецца спалоханы брат,
Ніхто не галосіць ля спаленых хат…
Восем дзясяткаў год край мой квітнее.
Ярчэй зіхаціцца, дужэе, мацнее
І кропля ў рэчцы, і колас у полі.
Жывём тут усёй нашай дружнай сям’ёю.
Суседзі, мой брат, тата з мамай і я –
Гэта Радзіма святая мая.
Як жа я моцна табой ганаруся!
Краіны няма мне мілей Беларусі!



***Вербаль Мілена,***
***5 “А”***





*Урбановіч Міраслава, 7 “Г”*





***Джулай Яўген, 7 “Л”***
*Пераможца агульнашкольнага літаратурнага конкурсу сярод вучняў 5-11 класаў*

## Восем дзясяткаў гадоў без вайны!

У маі прыгожа квітнеюць сады,
Весела лашчыць вясновае сонца,
Недзе ў гаі пяюць салаўі:
Мір і спакой у тых спевах бясконцых.

Восем дзясяткаў гадоў без вайны!
Помніць і славіць мы тое мусім,
Што мір і свабоду крывёй здабылі,
Прынеслі цаною жыцця беларусы.

Наша пашана мільёнам ахвяраў
Жудаснай, самай крывавай вайны,
Што вызвалялі Радзіму аддана
Дзеля святой, пераможнай вясны.

Слаўся, Радзіма, і ў згодзе жыві!
Болей  не ведай пагрозы варожай!
Хай жа спяваюць заўжды салаўі
Пра мір і спакой у краіне прыгожай.




*Джулай Ева, 5 “Б”*





*Еўлашэвіч Дзмітрый, 6 “Е”*





***Кажала Міліса, 10 “Б”***

*Уладальніца прыза чытацкіх сімпатый у агульнашкольным літаратурным конкурсе*

***

Зямля стогне, зямля плача:
Губіць людзей бой гарачы.
Сіл няма ўжо у яе
Цярпець гэта на вайне.
А салдаты моцны духам.
Той жахлівы svіст над вухам
Ад куль, што ляцяць усюды,
Не схісне іх дух магутны!
Жанчына плача па салдату:
Па сыночку ці па брату.
Успомніць мужа сваяго,
Там забілі і яго.
Не адны яны такія!
Не адны жыцці людскія
Серпам жудасным былі
Зжаты на сваёй зямлі.
І героем кожны быў,
Край свой родны бараніў.
Рвецца сэрца ад таго,
Што ужо няма яго.
Гарэлі вёскі і лясы,
Гарэлі дзеці і бацькі,
І бабулю з дзедам там
Немцы знішчылі. Боль нам!
За што, немец, люд збіраць
І бензінам паліваць?

Паліць усіх да аднаго?
А каб сына так твайго?
Крывёй палітая зямля…
У скрусе кожная сям’я…
Нашто ж патрэбная яна –
Вайна?..



*Хацяноўская Маргарыта, 7 “А”*





*Шыпіца*
*Вольга Юр'еўна*

## Беларусь непакораная

Калі ворагаў чорных нашэсце
Крок за крокам таптала зямлю,
То народ мой паўстаў нарэшце
За свабоду і волю сваю.

Не злічыць, колькі жыццяў бязвінных
Склаў у зямлю варожы снарад...
Скрозь гады мы пачуць не павінны,
Але і сёння зноў чуем набат.

Беларусь ты мая непакораная!
Ты прайшла праз кроў, слёзы і жах...
Засталася ўсё ж чыстая, вольная
І абрала найлепшы свой шлях!



*Урбановіч Міраслава, 7 «Г»*



*Цялюк Яўгенія,*
*2 "Д"*

# Мой татулечка - ваенны

Мой татулечка – ваенны,
У войсках сувязі служыў.
Да таго ж ён і дэсантнік.
На выдатным ліку слыў.

І не проста стаць на варце:
Берагчы Айчыну, дом!
Гэта ж, хлопцы, не на парце
Вам вычэрчваць батальён!

Ведаю, што падрасцеце,
Абаронцамі й вам быць,
Каб Радзіме, і планеце,
І ўсім нам спакойна жыць!





*Шыплюк Мацвей, 7 "Г"*



***Романовская Татьяна Николаевна***

## Памяти героев…

Не красками, не яркими мелками
Нарисовали жизнь на порванном холсте.
Прошли сквозь боль кровавыми стежками,
Спасли наш мир, идя наперекор судьбе
Вы небо над Отчизной удержали...
Награду получить смогли не все...
Растут теперь цветы, где вы за жизнь сражались.
И имя ваше увековечено в огне...
Мы помним каждый бой и каждую победу!
Следы о них давно присыпаны песком,
Но не стереть из памяти и слезы, и те беды,
Что вынесла земля, что вынес отчий дом.
Мы вас благодарим за мужество и храбрость!
За ясный и цветущий, мирный месяц май!
За краски жизни и надежды сладость,
Что принесла Победа  в наш прекрасный Край!

*Романовский Андрей, 6 “А”*







***Філімонава Анастасія Анатольеўна,***
*настаўнік гісторыі*
*Пераможца агульнашкольнага літаратурнага конкурсу сярод настаўнікаў*

## Ветэраны вайны...

Ці можа час загойваць раны?
Напэўна, можа, скажаце мне вы...
А я не веру, бо гляджу на ветэранаў,
Параненых падзеямі вайны.

З тых дзён мінула восемдзесят вёсен,
Калі парады пераможныя прайшлі,
А ў іх вачах пакутных, як у люстэрку,
Я бачу страшныя карціны той вайны.

Іх з кожным годам застаецца усё меней,
Сапраўдных сведкаў страшнае бяды.
І больш за ўсё ім хочацца, каб ў свеце
Ніколі больш не ведалі вайны!

І сёння мы – іх праўнукі і ўнукі –
Удзячнымі заўжды павінны быць!
Жыццё пражыць і годна, і сумленна,
Каб памяць аб іх подзвігах захаваць!

Яны маглі каб намі ганарыцца,
І за Радзіму не перажываць,
Павінен кожны з нас ўвесь час імкнуцца –
Спакой і мір у свеце захаваць!



*Блыш Мілана, 9 "В"*



***Паўлючук Яна,***
*10 "Б"*

# Вайна

Без шкадавання і без жалю
Вайна памчалася за намі
На крылах смутку, смерці. Днямі
Мы слёзы болю пралівалі.
Бяда навісла над Радзімай,
Таму салдаты йдуць у бой
За жонку, маці і дзяціну,
Каб кат сышоў з зямлі маёй.
Не за сябе яны змагаліся,
Не за сябе пад кулі йшлі.
І, дзякуй ім, мы дачакаліся
На лёс шчаслівы на зямлі.
Плывуць па нівах скрозь камбайны,
Квітнеюць сёлы, гарады.
Значыць, жыццё сваё, салдаты,
Вы не дарэмна аддалі.



*Паўлючук Яна, 10 “Б”*



***Жук Валерыя,***
*9 “Б”*



***

Хто гэта ціхенька так плача
у хаце цёмным вечарком?
Яна ніколі не ўбачыць
свайго сыночка з ўнучком.

Бо сын пайшоў на фронт ваенны
абараняць свой родны край.
Ён быў Радзіме сваёй верны,
ад яго здрады не чакай.

А ён ляжыць, забіты куляй,
як той аролчык у гарах,
крывавым катам. Плач, матуля!
Ён быў адзіны ў цябе, ах!

А як жа ўнучак? Ён маленькі,
яшчэ ў школку не хадзіў,
пабег да сябра ў лес, да Генкі,
ды там … на міну наступіў.

Снаху застрэлілі фашысты,
Упала, бы знясла каса.
Хаваць дапамаглі танкісты.
Скупа кацілась іх  сляза…

Хто гэта ціхенька так плача
у хаце цёмным вечарком?
Сын больш ніколі не ўбачыць,
Як апусцеў бацькоўскі дом.



*Андрушкевіч Эмілія, 7 «Г»*





***Тыбулевіч Максім,***
*8 “І”*
*Пераможца агульнашкольнага літаратурнага конкурсу сярод вучняў 5-11 класаў*

## Успамін

Што за здымак такі? Раскажы ты мне, дзед.
Хто з усмешкай на нас пазірае?
Хлопец гарны такі ў гімнасцёрку адзет
Пра свой лёс як бы апавядае.

Распавёў мне дзядуля пра бацьку свайго
(Фотаздымкі расказ пацвярджалі),
Як вайну перажыў, як ў салдаты пайшоў,
А вярнуўся – калгас падымалі.

Прадзядуля тады хлапчуком горкім быў,
Калі ў вёску фашысты ўляцелі,
Але ворага выраз надоўга застыў,
Крыкі грозныя ў памяць заселі.

Як раптоўна знямела, застыла сяло,
Вёска людная ўраз апусцела.
Як матуля сабрала усіх пад крыло,
Сям’я суткі ў падвале сядзела.

Колькі мукаў прыйшлося малым перажыць,
Працаваць нараўне з мужыкамі,
Бо сям’ю немалую патрэбна карміць,
Модлы Богу чытаць вечарамі.

Я не помню, вядома, прадзеда свайго,
Але памяць аб ім засталася.
Многа раз мы яшчэ ўспаміналі яго,

Доля цяжкая ім дасталася.
Многа вёснаў прайшло з таго часу, калі
Мае продкі жылі, працавалі,
Успамін аб іх памяць маю ажывіў,
Яны варты, каб не забывалі.



*Сяргей Нікіта, 7 «Б»*



*Савіцкі Даніїл, 7 "Б"*





*Дубатовка Ксения,*
*10 «Б»*

## Война - это боль

Война… Война… О сколько в слове боли,
Гибнут когда в бою друзья твои.
Когда за Родину ты не жалеешь крови,
Мечтаешь встретить близких и родных.

Нельзя забыть задымленное небо,
Когда сжигали женщин и детей,
Когда еда – вода и корка хлеба
На всю семью и с фронта нет вестей.

Я не хочу, чтоб с нами то случилось,
Что пережили прадеды мои.
Хочу, чтобы навечно поселились
На всей планете Доброта и Мир.



*Сахонь Роман, 7 «А»*



***Сівоха Яўгеній**, 3 “В”*
*Пераможца агульнашкольнага літаратурнага конкурсу сярод вучняў пачатковых класаў*

## Мая краіна - Беларусь

Мая краіна – Беларусь!
Што значыць гэта слова?
Чым вабіць да сябе усіх?
Чым так яна знаёма?

Адказ шукаю у бацькоў.
І мне яны сказалі:
“Лепшы кут у свеце той,
Дзе жывём мы з вамі.

Ў гады крывавыя вайны
Нікому не сакарыўся,
А, як адзін, – і стар і мал –
Народ за волю біўся.

За маці, жонку і дзіця
Бясоннымі начамі
Змагаўся прадзед твой – Іван,
Каб жылі тут мы з вамі.

На той вайне адчулі ўсе:
Галоўнае на свеце –
Любіць зямлю і з працы жыць,
Каб нараджаліся дзеці,

Прачнуцца зранку, узяць касу
І босым выйсці ў поле,
Адчуць павагу да таго,
Жыццё хто страціў у бoі.

Твая краіна – Беларусь!
Як люба гэта слова,
Жыві і ведай, беларус –
Гэта гучыць горда!!!”





*Сівоха Яўгеній, 3 “В”*



***Чамаданаў Іван,***
*8 “Г”*
*Пераможца агульна-школьнага літаратурнага конкурсу сярод вучняў 5-11 класаў*

# Будні маіх бацькоў

Турботы і клопаты з самага ранку
у нашай матулі шмат спраў спазаранку:
сняданне для Машы, для хлопцаў і таты,
гімнастыка, душ і камп’ютар з гарбатай ...

І пальцы рупліва пабеглі па клаве.
Работа пайшла на ўвесь дзень ў нашай мамы.
Калі-нікалі зазвініць тэлефон,
і мама адразу: “Цішэй, бо сазвон!”

А тата… Яшчэ не прачнуўся я толкам,
а ён у спартыўнай стаіць сваёй форме
І ў снег, і у дождж. Не праблема надвор’е,
калі на кану прыклад твой і здароўе.

Я ім ганаруся, за ім я цягнуся,
падобным да таты быць вельмі імкнуся.
Актыўны, спартыўны і добры душой,
ён любіць нас з мамай, наш дом і бацькоў.

# Казка пра Янку і мудрага Вадзяніка

У адным сяле жыў ляйдака-хлапец. Звалі яго Янка. Не любіў працаваць ды бацькам дапамагаць. На вучобу глядзеў, як на нешта яшчэ больш страшнае, чым работа. А бацькі маўчалі, патуралі яму. Вядома, адзіны сын у сям'і. А Янка гэтым і карыстаўся. Даходзіла да таго, што і лыжку на стол падай яму, і відэлец, і талерку забяры, памый. Лусту хлеба гатовага не мог адрэзаць і вады прынесці маці, каб паесці згатаваць. То ў яго нага баліць, то ў вуха страляе… І гэтак вось жыў.

Назіраў за гэтым часта Вадзянік, які жыў у рацэ, што ля вёсачкі працякала. Слухаў  грубыя размовы Янкі з маці ці татам і ківаў галавою са спачуваннем. Шкада было бацькоў, а яшчэ болей – гэтага хлопца.  Што з яго будзе далей?! Вырашыў Вадзянік правучыць Янку, каб стаў паважаць бацькоў і даражыць імі.

Аднойчы прыйшла маці да ракі адзежу папаласкаць. Бацька, вядома, вырашыў дапамагчы, цяжкія ночвы паднесці. І тут Вадзянік як падыме хвалю, ды як схопіць старых! Толькі раскіданае адзенне засталося на беразе і больш нікога…

"Вось дык гора і бяда прыйшла!" – казаў стараста вёскі, калі расказваў Янку пра страшную трагедыю. А вось аднасяльчане па-рознаму выказваліся на гэта. Адны шкадавалі хлопца. Другія таксама спачувалі, але між іншым казалі, што так яму і трэба. Цяпер хай пажыве адзін, хай паспрабуе быць дарослым і самастойным.

Першыя дні галодны хадзіў Янка і нават прыхварэў. Не мог паесці згатаваць, у печы агонь развесці.  Хацелі суседзі дапамагчы яму, але Вадзянік прыгразіў жыхарам вёскі забраць з кожнай сям'і па сыну ці дачцэ, калі аслухаюцца яго. Таму ўсе рабілі выгляд, што нічога не заўважаюць, і жылі сваімі ўласнымі турботамі.

А бацька і маці ў той час мелі выдатны адпачынак! Гасцілі яны ў Вадзяніка.

Прайшоў не адзін месяц, пакуль Янка стаў па-сапраўднаму дарослым чалавекам. Навучыўся цаніць усе, што здабываецца цяжкай працай. Кожны дзень успамінаў ён смачны хлеб маці, дзеруны са шкваркамі ды суп з грыбамі, якіх ён і не збіраў ніколі.

І вось летнім спякотным днём прыйшоў ён да ракі папаіць каня, апаласнуцца пасля касьбы. Прылёг на беразе ў траве, і

сніцца хлопцу, што маці нясе яму халоднае малако з духмяным караваем і так ласкава кажа: “Еш, дарагі сынок!”

Падняўся Янка ды як разрыдаецца, як закрычыць: “Мамачка і татачка, я па вам так сумую!”

У гэты момант Вадзянік адчуў, што Янка ўсё зразумеў і можна вярнуць яму яго бацькоў. Узняў ён хвалю, і выйшлі адтуль дарагія і блізкія Янку людзі.

З таго часу зажылі яны дружна, усю работу рабілі разам. І такім клапатлівым стаў Янка, што ставілі яго цяпер у прыклад усім!



*Чамаданаў Іван, 8 “Г”*

# Бабулі з дзядулем з нагоды залатога вяселля

Іх шлюбу – пяцьдзясят!
Вы толькі ўявіце,
Які багаж падзей
У Ларысы з Віцем!

Сыноў чацвера,
Тры нявесткі,
Унукаў сем,
І страта ў сэрцы.

Малодшы сын
быў асаблівым.
Кароткі лёс,
Антон загінуў.

Дарогаў шмат
і пераездаў.
То шык і бляск,
То лес бязмежны.

Была й вайна,
страх адзіноты,
што муж загіне,
а дзеці ўжо сіроты…

Той страшны час
забыць бы, дзесьці
схаваць глыбока,
але не ў сэрцы.

Там месца трэба
для падзей,
што дораць радасць
ад унукаў і дзяцей.







*Чемоданова*
*Татьяна Михайловна*

## О женщинах

Соль земли – это женщина, мать.
Лишь она так способна любить и прощать.
Находить нужный слог в сложный час,
поднимать на борьбу и учить воевать,
Побеждать страх и боль, неудачу, провал.
Подниматься с колен и искать тот запал,
говорить себе снова: “Смогу! Я добьюсь!
В меня верит Она. Я прорвусь, не согнусь!”
А объятья её греют жарче костра,
Если вдруг ты нагой и обнимет Она.
Теплота и покой на душе в тот же час,
И не страшен тебе темных чар даже сглаз.
Береги же её! Помни силу и соль,
что дает всем Она и земле, дорогой.
Как бесценны поступки её и слова,
что роняют уста, пробуждая тебя.
Пусть же вечно любима будет Она!
До небес пусть возносят её имена!
Пусть лишь счастье и радость сияют в глазах!
Пусть воспетою будет на всех языках!

***Казаков Кирилл,** 3 “В”*
*Победитель Первого общешкольного литературного конкурса среди учащихся начальных классов*



## Счастье в простом

Каждый ребенок на нашей земле,
Хочет жить в дружной и крепкой семье.
Чтоб мама и папа всегда были вместе,
Сестры, братишки не сидели на месте,
Бабули пекли пироги да булочки,
Дедули на санках везли на прогулочку.
Потом за семейным огромным столом
Собраться и поговорить обо всем.
Для каждого важна опора на близких,
Будь ты на вершине иль падаешь низко.
И каждому видится счастье в простом:
Родина, мир, и семья, и свой дом.



*Орёл Маргарита, 9 «Е»*




***Мицкевич Людмила Иосифовна,***
*бабушка Мицкевича Антона, 7 “Г”*
*Победитель общешкольного литературного конкурса среди родителей*

# Разговор с родительским домом

В  скромной деревушке, где метель мела,
Женщина тихонько к дому подошла.
– Здравствуй, милый домик, как твои дела?
– А…, вот все дорожки вьюга замела.
Хочется погреться, хочется тепла.
Печь-то ледяная, мёрзлая вода!
Был бы жив хозяин – жизнь была б другой!
Не хотел бы жизни больше никакой!
Что ж поделать – снова буду лето ждать!
А теперь хотел бы у тебя узнать,
Как моя хозяйка? Передай привет!
С нетерпеньем буду ждать её приезд.
Ласточек-касаток в стаи позову,
Вместе с ними песню звонкую спою.
У куста жасмина соберу цветки,
Под ноги хозяйке брошу лепестки.
И скажу при встрече, открывая дверь:
«Долго мы с тобою будем жить, поверь!»
Женщина, платочком вытерев глаза,
Говорила дому нежные слова:
– Милый, славный домик, благодарны мы
За любовь, за ласку, детские мечты!
Ждёт хозяйка встречу, помнит о тебе,
Говорит, что в доме счастье, как нигде!
Ты своей хозяйке верь… и ожидай!
Скоро будет встреча, скоро будет май!



*Мицкевич Людмила Иосифовна*



*Янковская*
*Алла Геннадьевна*

# Моя семья - основа жизни

Прекрасен Лувр, и на Бали заманчивые пляжи.
В Египте пирамиды есть, а в Африке – пигмеи.
В Калькутте встретят вас слоны, танцующие даже,
А в зоопарках ждут гостей причудливые змеи...

Как много мест, куда влечет нас впечатлений жажда!
Хотят повсюду побывать и взрослые, и дети,
Но место есть, куда потом вернуться хочет каждый:
Обычный дом, где ты живешь, дороже всех на свете.

Где можно смело признавать ошибки и просчеты,
Быть откровенным и простым, не хвастая, ни каясь,
Легко на время позабыть волненья и заботы
И просто быть самим собой, никем не притворяясь.

Ничто не в силах заменить рук материнских ласку,
Что снимет, как по волшебству, тревогу и усталость,
Ведь даже самый умный слон вам не расскажет сказку
И колыбельной не споет, чтоб ночью лучше спалось.

Семья – твой щит в любой беде, твой зонт в любом ненастье.
И пусть с тобой произойдет немыслимая драма,
В семье нас неизменно ждет спасенье от ненастья:
Всегда утешит и поймет заботливая мама.




Никон Елизавета, 2 "Б"



***Раманюк Дар’я,***
*9 “Б”*

***

Сям’я ёсць крыніца любві, дабра,
Дзе ласкавым цяплом саграваюць з мала.
Бацькі!.. Не знайсці нам найлепей сяброў.
З імі кожны дарогу маленства прайшоў.

Сям’я – гэта цёплы і радасны дом,
Дзе не будуць страшны ні маланка, ні гром.
Прыйдзеш нават калі ты дамоў сярод ночы,
Цябе стрэнуць  заўсёды адданыя вочы.

Тут падтрымаюць, калі будзеш хмуры,
Бо бацькі – абарончыя крылы ад буры.
Яны спыняць твой плач і запаляць надзею,
Бо сям’я грэе сэрца, як сонца лілею.

Трэба ведаць – сям’ю тут не спыніць нічога:
Ні гаротная страта, ні жыцця катастрофа.
Сям’я, як бацькоўскі дом, не прадаецца,
Прадасць толькі той, у каго няма сэрца.



*Блашко Данііл, 8 «Е»*

*Ятко́ўская Вольга,*
*5 «Е»*



# Мая сям'я - маё багацце!

Мая сям'я – маё багацце!
Не трэба большага мне шчасця.
Каб мець шчаслівую сям'ю,
Каб гаварыць бацькам: "Люблю!"
Сям'я – жыццю спрадвек аснова,
Найдаражэйшае ўсім слова,
Поўнае радасці, красы,
Святла, кахання, дабрыні.
Няма дарожайшага скарба,
Чым мама з татам, родна хата.
Тут і падтрымку я знайду,
І сваіх родных абдыму.
Бацькам прызнацца зноў хачу:
"Я вельмі-вельмі вас люблю!"



*Яткоўская Вольга, 5 «Е»*



*Таврель Арина,*
*1 “А”*

***

Родная семья – это гордость моя!
В ней мама и папа, сестричка и я.
Семья моя очень крепка и дружна,
И для меня она ох, как важна!
С сестричкой играю, пою и читаю,
А с мамой готовлю и убираю.
И папочка мой не стоит в стороне,
Всегда помогает, чем может, он мне.
Ещё мы все вместе по парку гуляем
И бабушку нашу всегда навещаем.



*Таврель Арина, 1 “А”*

*Місік Дзіяна,*
*9 “Б”*



# Трэба родных сваіх любіць

Узгорак. Направа дарожка вядзе
Да мілай сядзібы бабулі.
Там у дружнай сямейцы сваёй, чарадзе
Нам да працы любоў прывілі.
Такой дабрыні і спагады шчырай
Сярод суседзяў яшчэ пашукаці.
Здаўна ў продкаў маіх быў звычай
Спяшацца з падмогай, каб падтрымаці.
Так і цяпер  прадаўжаем традыцыю
Узаемнасць, павагу, падтрымку цаніць.
Абяцаем, што мы ўжо па інтуіцыі
Будзем родных заўжды берагчы і любіць.



*Венская Арына, 2 “Д”*



***Пракопчык Вікторыя,***
*5 "Б"*

# Мая сям'я - цэлы сусвет

У маёй сям'і ёсць сэрца –
Тата з мамаю і мы.
Ад усіх пяшчота льецца.
Кожны  важны у сям'і,

Тата ўсім нам дапаможа,
Мама грэе нас цяплом.
Разам ўсё мы пераможам.
Зберажом наш ўтульны дом!

У ім сяброўства, лад пануе,
Любоў, спагада і давер.
Гэта ўсё, што нас мацуе,
Наш ахоўны ёсць бар'ер.

Сям'я наша – дабравесце,
Ўтульны і бяспечны свет,
Няма лепей ў свеце месца,
Гэта цэлы наш сусвет.







*Гранацюк Арына, 5 “Б”*




*Аніська Дар’я,*
*7 “Г”*

## Мама

Мама – маё першае слова…
Вельмі-вельмі я яе люблю.
Мама – мая родная мова…
Кожны подых мамін я лаўлю.
Варта толькі прыглядзецца:
Цэлы свет сагрэт наўкруг
Цеплынёй матулі сэрца,
Далікатных, добрых рук.
Мама – самы лепшы сябар.
Мама верыць у мой узлёт.
Мама здзейсніць мае мары.
Мама бед растопіць лёд.




*Якімчык Аліна, 5 "Д"*





*Трацяк Рыта Антонаўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*Пераможца агульнашкольнага літаратурнага конкурсу сярод настаўнікаў*

## Мне ўжо дзесяць

Маладое, жывое, агністае
Сонца ранак абудзіць над школаю —
І жыццё забурліць — галасістае,
Трапяткое, з хітрынкай, вясёлае…
Як дзяўчыначка звонкагалосая,
Школа выбегла ў поле жытнёвае:
«Мне ўжо дзесяць! Амаль жа дарослая!
Але ўсё мне нязведана-новае!
Таямнічае ўсё і цікавае
На дарогах адкрыццяў і вопыту…
І сяброў сабе новых шукаю я,
Атулю іх любоўю і клопатам.
Як сястрычка, вазьму першакласніка
За руку, павяду ў класы светлыя,
Пазнаёмлю з натхненнем і шчасцейкам,
З кнігай, з Ведаў Краінай прыветнаю…
Ў класе пятым сваім аднагодкам я
Раскажу пад сакрэтам, па-змоўніцку:
Ўсе мы тут не чужыя — адна сям'я,
Што іх талентам-поспехам поўніцца…
З захапленнем і ўдзячнасцю шчыраю
Гляну ўслед я і выпуску новаму.
Не трывожаць іх цяжкасці выраю:
Крылы юных да высяў гатовыя!
…Вераснёвае сонейка босае
Зноў бяжыць праз палеткі жытнёвыя.
Мне ўжо дзесяць! Амаль жа дарослая!
Але вабяць мяне далі новыя!»



*Арол Маргарыта, 9 “Е”*





***Мінгілевіч***
***Таццяна Антонаўна***
*Пераможца агульна-школьнага літаратурнага конкурсу сярод бацькоў*

## З днём нараджэння, родная школа!

Маім удзячным чытачам,
Што на радкі мяне натхняюць!
Для вас прыемна так ўсплываюць
Малюнкі школьнага жыцця!

Сардэчна ўсіх віншую вас
З днём нараджэння, юбілеем!
І майце гонар несці сцяг:
Я – вучань  школы 39!

Расціце разам з ёй заўжды,
Вучыцесь плённа і старанна!
Хай ў сэрцы светач зіхаціць,
Ад школы вам замілавання!




*Мінгілевіч Аляксандра, 5 "Е"*



***Чырко Яраслаў**, 6 "А"*
*Пераможца агульнашкольнага літаратурнага конкурсу сярод вучняў 5-11 класаў*

# Мая школа

Матуля з татам прывялі мяне сюды,
Ніколі не забуду дзень той светлы!
І хмаркі ў небе нейк не так плылі,
І кожны стрэчны асабліва быў прыветны.

Ўжо шмат разоў прымерваў да сябе
Я ў мроях вучня, што спяшаецца да школы.
І сцежку, што туды мяне вядзе,
Сто раз прайшоў і хутка, і паволі.

Адразу школа ўразіла мяне:
Велічна-светлая, ну чыста прыгажуня!
Здалёк яе відаць, адкуль ты ні ідзеш.
Сучасная, утульная красуня!

Сягоння я вучуся ў шостым класе
І шмат чаго ўжо маю за спіной.
Упэўнена скажу, што ганаруся
Трыццаць дзявятаю я школаю сваёй.

Усё хутчэй гады ў школе ляцяць…
Прадметы новыя і новыя імгненні…
Прыспее час ў свет вольны адлятаць –
І зменяць нас другія пакаленні.



*Базылевіч Аляксей, 2 «Д»*



***Таврель Агата,** 5 “Е”*
*Обладатель специального приза директора школы*

## Любимой 39-й

На Ольшанке школа есть.
И в ней жителей не счесть.
Все хотят туда попасть.
Там директор – просто класс!
Всех детей в лицо узнает,
Их приветливо встречает,
И коллег не обижает,
премиями поощряет.
В школу эту я хожу,
С одноклашками дружу,
Все предметы уважаю,
Малышей не обижаю,
Всем улыбки я дарю
И спасибо говорю
Нашим классным педагогам:
У них всех талант от Бога.
Своей школе к дню рожденья
Ставлю «десять» без сомненья.




*Таврель Агата, 5 “Е”*





*Мінгілевіч Аляксандра,*
*5 "Е"*

## Да першакласнікаў

Гой вы, хлопчыкі, дзяўчынкі,
Што у першы клас ідуць
Нашай школы-юбіляршы,
Ланцужком трымаюць пуць!

Мноства кветак у далонях,
Полымя ў ясных вачах,
Быццам лета мімаходам
Пунсавее на лугах!

Свеціць сонца над Альшанкай!
Шлях мой распачаўся тут.
Крочу ў школу кожным ранкам,
Разам з школаю расту!




*Мінгілевіч Аляксандра, 5 “Е”*





***Мінюк Даніл,***
*7 “Г”*

# Другі мой родны дом

Мой першы дзень, мой новы клас
Прыемна ўспомніць мне той час,
Настаўнікаў, сяброў, прадметы…
Ўсіх, хто дае мне столькі ведаў,
Шмат радасці, забаў і шчасця,
Што нішчыць у душы нянасце.
Таму кажу я школе “Дзякуй!”,
Настаўнікам маім, сябрам.
Чакаю з вамі кожным ранкам
Сустрэчы, і не сумна нам.
Сваю я школу не забуду,
Як змагу, славіць яе буду,
Бо і цяпер, і назаўсёды
Яна – другі мой родны дом!




*Вансовіч Аляксандра, 2 "Д"*





*Штукель Лізавета,*
*6 “А”*

## Школе любімай я песню спяваю…

Школе любімай я песню спяваю,
У вершы падзяку я ёй выражаю.
Ты храм мой навукі, цікавых людзей,
Настаўнікаў, кніжак, чаканняў, надзей!

Табе я ўдзячна за веды, уменні
За добрых, вясёлых і верных сяброў.
За тое, што будзіш жаданні-памкненні
Я ведаю: ты назаўсёды са мной!



*Штукель Лізавета, 6 “А”*





*Янковская*
*Алла Геннадьевна*

# Школе любимой я песню пою

Когда строитель строит дом,
Никто не начинает с крыши;
Чтоб он надёжней стал и выше,
Необходим фундамент в нём.

И если с детства возводить
Ты начинаешь жизни зданье,
Хорошее образованье
Сначала нужно получить.

Оно фундамент для всего,
Чем будет наша жизнь богата:
Друзья, семья, жильё, зарплата
Всегда зависят от него.

Ученика прилежный труд,
Твоих наставников участье
Благополучие и счастье
Незримо в классах создают.

Минуют школьные года,
Все пролетят, как птичья стая,
Бездельничая и играя,
Ни дом, ни будку, ни сарая,
Жизнь не построишь никогда.



*Урбанович Мирослава, 7 “Е”*

## I Раздзел “Беларусь непакораная”


| | | |
|---|---|---|
| *Прадмова* | | 3 |
| Ты будзі сваю памяць! | Трацяк Р.А. | 4 |
| Мая Радзіма дарагая! | Герасімовіч П. | 6 |
| Беларуси непокорённой | Янковская А.Г. | 8 |
| Символ непобедимой Беларуси | Янковская А.Г. | 10 |
| ***“Мы з вамі не сведкі жахлівай бяды…” | Вербаль М. | 11 |
| Восем дзясяткаў гадоў без вайны! | Джулай Я. | 12 |
| ***“Зямля стогне, зямля плача…” | Кажала М. | 14 |
| Беларусь непакораная | Шыпіца В.Ю. | 16 |
| Мой татулечка – ваенны | Цялюк Я. | 17 |
| Памяти героев… | Романовская Т.Н. | 18 |
| Ветэраны вайны… | Філімонава А.А. | 20 |
| Вайна… | Паўлючук Я. | 22 |
| ***“Хто гэта ціхенька так плача…” | Жук В. | 24 |
| Успамін | Тыбулевіч М. | 26 |
| Война – это боль | Дубатовка К. | 28 |
| Мая краіна – Беларусь! | Сіваха Я. | 30 |


## II Раздзел “Мая сямья – жыцця аснова”


| | | |
|---|---|---|
| Будні маіх бацькоў | Чамаданаў І. | 32 |
| Казка пра Янку і мудрага вадзяніка | Чамаданаў І. | 33 |
| Бабулі з дзядулем з нагоды залатога вяселля | Чамаданаў І. | 35 |
| О женщинах | Чемоданова Т.М. | 36 |
| Счастье в простом | Казаков К. | 37 |
| Разговор с родительским домом | Мицкевич Л.И. | 38 |
| Моя семья – основа жизни | Янковская А.Г. | 40 |
| ***“Сям’я ёсць крыніца любві, дабра…” | Раманюк Д. | 42 |
| Мая сям’я – маё багацце! | Яткоўская В. | 43 |
| ***“Родная семья – это гордость моя!” | Таврель А. | 44 |
| Трэба родных сваіх любіць | Місік Д. | 45 |
| Мая сям’я – цэлы сусвет | Пракопчык В. | 46 |
| Мама | Аніська Д. | 48 |


## III Раздзел “Школе любімай я песню спяваю”


| | | |
|---|---|---|
| Мне ўжо дзесяць! | Трацяк Р.А. | 50 |
| З днём нараджэння, родная школа! | Мінгілевіч Т.А. | 52 |
| Мая школа | Чырко Я. | 54 |
| Любимой 39-й | Таврель А. | 56 |
| Да першакласнікаў | Мінгілевіч А. | 58 |
| Другі мой родны дом | Мінюк Д. | 60 |
| Школе любімай я песню спяваю… | Штукель Л. | 62 |
| Школе любимой я песню пою | Янковская А.Г. | 64 |

